*УДК 821.161.3-312.2‘06*А.Казлоў*В.Гапееў*

**К. В. Ніцыеўская**
***Навук. кір. – А. В. Брадзіхіна, канд. філал. навук, дацэнт***

# МІСТЫЧНЫ ЭЛЕМЕНТ У СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЕ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ТВОРЧАСЦІ АНАТОЛЯ КАЗЛОВА І ВАЛЕРЫЯ ГАПЕЕВА)

*У артыкуле разглядаюцца асаблівасці выкарыстання містычных элементаў у беларускай прозе мяжы тысячагоддзяў на прыкладзе*

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| *твораў* | *У. Казлова* | *(«Дзеці* | *ночы»,* | *«Нішто »),* | *В. Гапе ева* | |
| *(«Ноч цмока»). Мэта даследаванн я – вызначэнне функцыянал ьнага аспекту і асаблівасце й праяўлення ў тэксце містычных элементаў.* | | | | | | |
| *Аўтар* | *прыходз іць* | *да* | *наступ ных* | *высноў:* | *праз* | *міст ыку* |
| *асэнсоўваю цца паглыбленн е* | *актуаль ныя* | *праблемы* | *сучасна сці,* | *адбыва ецца* | | |
| *ў рэальнасць* | *міфа;* | *звышнатур альнае* | *дапама гае* | | | |

*трымаць чытача ў напружанні, выклікае страх і інш.*

Увасабленне страху праз містыку – адзін з самых распаўсюджаных прыёмаў у сучаснай беларускай прозе. Да ліку аўтараў, што пішуць у дадзеным жанры, належаць А. Казлоў («Дзеці ночы», «Нішто»), Л. Рублеўская («Дзеці гамункулуса», «Ночы на Плябанскіх млынах», «Жаніх пані Данусі»), В. Гапееў («Праклён», «Ноч цмока»), Р. Баравікова («Вячэра манекенаў») і многія іншыя.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Папулярнасць містыкі і сярод аўтараў, і сярод чытачоў лѐгка растлумачыць яе вызначальнымі рысамі. Па-першае, містыка, як паджанр
фантастыкі, асвятляе рэчы, немагчымыя для рэальнага свету. Падругое, яна – што цікава, улічаючы папярэдні пункт – спрабуе падаць звышнатуральнае максімальна набліжаным да рэальнасці. Па-трэцяе, містыка належыць да літаратуры займальнай, і не дзіўна, што нярэдка ў яе аснове ляжыць дэтэктыўная інтрыга. Нарэшце, містыка не заўсѐды ставіць перад сабой мэту напужаць чытача, а гэта значыць, не кожны такі тэкст прэтэндуе на прыналежнасць да літаратуры жахаў. Як і не кожны твор літаратуры жахаў абавязкова павінен быць містычным. Для чытача гэты жанр прыцягальны як спроба ўцячы за межы штодзѐннасці, акунуцца ў незвычайнае. Містыцы, без перабольшвання, пад сілу ўзняць на паверхню з цѐмных закуткоў падсвядомасці архаічныя страхі, атрыманыя ў спадчыну ад далѐкіх прод

каў – забабонных, цѐмных, якія спасцігаюць рэчаіснасць душой, а не галавой, – і ажывіць іх.

Свет містычнай аповесці «Дзеці ночы» А. Казлова, дзе мае месца змаганне д‘ябла з богам за чалавечыя душы, намаляваны ў змрочных фарбах. Вуліцы тут поўняцца бамжамі, якіх больш паспяховыя (ці ўдачлівыя) гараджане лічаць за лепшае не заўважаць, баючыся нават думкі аб тым, што маглі апынуцца на іх месцы. І вось, здаецца, сілы зла блізкія да перамогі, колькасць паслядоўнікаў д‘ябла, носьбітаў трох шасцѐрак на грудзях, у сучасным соцыуме набыла вялікія маштабы. Але ўражанне злавеснасці і непазбежнай катастрофы ў аповесці перакрэсліваецца вобразам самога д‘ябла, які паводзіць сябе зусім не як уладар пекла, здольны ўводзіць слабых духам у спакусу. Яго пагрозы, перамешаныя са звычайнай лаянкай у вясковай манеры, звернуты да жанчыны без канкрэтнага месца жыхарства, якая не можа нават вызначыцца з тым, каго іменна кахае. Зварот аўтара да камічнага, прыніжэнне вобраза д‘ябла наводзіць на думкі аб старажытных інтэрмедыях, у якіх звычайны селянін аказваецца разумнейшым за чорта. А інтэрмедыі, як вядома, мелі забаўляльную функцыю.

Больш за тое, часам здаецца, што аўтар знарок стварае сітуацыю абсурду, а не карціну жахлівага ці хаця б небяспечнага жыцця. Так, напрыклад, выглядае размова паміж гаспадаром ночы і Нінай,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

каханкай галоўнага героя: «Ды пайшоў ты…» – «Я заўсѐды на нагах». – «І я, як бачыш, стаю». – «Пакуль стаім, а хутка ляжам». – «Пад цябе?» – «Вар‘ятка. Вялікі гонар спазнацца са мною» [1, с. 45]. Цікава і тое, што галоўная сюжэтная лінія своеасаблівым чынам закальцоўваецца. Твор пачынаецца з таго, што слуга д‘ябла, былы бомж Вілен, едзе ў дарагім аўто да месца ахвярапрынашэння. Здаецца, што герой, як той Абломаў, бясконца доўга пражывае адзін дзень (канкрэтней – адну ноч), і ў канцы твора ѐн апынаецца на тым месцы, з якога пачынаўся сюжэт. З іншага боку, чытачу прадстаўлена некалькі версій падзей: самога Вілена, яго каханай, Ніны, і Гурона, намесніка д‘ябла, задача якога – вербаваць новых дзяцей ночы.
У разгортванні лініі, звязанай з каханай галоўнага героя, таксама шмат супярэчнасцей. Так, бог, надыктоўваючы Ніне дзѐрзкія адказы ў размове з д‘яблам, нічога не робіць дзеля яе абароны. У выніку жанчына апынаецца на месцы ахвяры для гаспадара дзяцей ночы. Сама Ніна здзіўляе адносінамі да мужчын, якія яе кахаюць. То яна трапляе ў сітуацыю, дзе Юрый, замена знікнуўшага Вілена, называе яе жанчынай лѐгкіх паводзінаў, то ўжо на наступны дзень яна мілуецца са сваім крыўдзіцелем, забыўшыся на сваѐ неабдымнае каханне да

Вілена. Увечары, аднак, Ніна сядае ў машыну да незнаѐмага хлопца, які не хавае сваіх намераў наконт далейшага баўлення часу. Паміж кожным з гэтых эпізодаў не праходзіць і дня. Такім чынам, нягледзячы на падзагаловак «містычная аповесць», твор, на наш погляд, прысвечаны хутчэй асэнсаванню маральна-этычных праблем сучаснасці, але ўчынкі герояў часта псіхалагічна не матываваны, што ў цэлым зніжае мастацкае ўражанне. Наяўнасць містычных элементаў (апісанне звышнатуральных падзей; уплеценасць у сюжэт тагасветнага, невытлумачальнага як дадзенасці) не ставіць перад сабой мэты напужаць чытача, а, хутчэй, спрыяе займальнасці твора. Нагнятанню ж атмасферы, адчуванню чытачом такой мадыфікацыі страху, як неспакой, спрыяе сам свет аповесці, што знаходзіцца напярэдадні катастрофы – не столькі звышнатуральнай, колькі маральнай. Страта людзьмі маральных каштоўнасцей пададзена тут праз паглыбленне ў праблему бяздомнасці: «Бамжы што балячка на целе. Яна муляе, свярбіць, няспынна даймае. Ад яе хутчэй імкнуцца пазбавіцца, а яна ўсѐ больш і больш разрастаецца. Вось таму ўзгаданыя табою міліцыянты і прыкладныя грамадзяне-гарадчукі толькі радыя, калі знікае абрыдзелы
РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

бомж з іх вакхальнага поля» [1, с. 27].
У апавяданні «Ніштo» А. Казлова таксама заўважныя містычныя матывы. Тут ужо можна гаварыць калі не пра страх, то пра пра неабдымную тугу як асноўную атмасферу твора. Галоўны герой, Юрдок,
пакутуе ад адзіноты і пачуцця віны, бо лічыць, што забіў сваю жонку. І, назіраючы за думкамі самотнага старога, жыццѐ якога паволі згасае на зямлі, закінутай людзьмі ў выніку радыяцыйнага забруджвання, чытач паступова пранікаецца надрыўна-шчымлівай споведдзю героя. Ніштo – істота не вядомая беларускаму фальклору, падобная да здані, увасабленне калектыўнага духу вѐскі. Напачатку можна падумаць, што яго ўвогуле не існуе, што яно ўяўляе сабой унутраны голас ці сумленне старога (гэткая спрэчка цела з душой у стылі Ф. Віѐна). Але чым далей чытач паглыбляецца ў твор, тым больш пераконваецца ў містычным паходжанні гэтай істоты. Ніштo наведвае героя ўначы, спрыяючы яго неабдымнай тузе па мінулым, страху і адначасова абыякавасці да адзіноты, ды яшчэ віне – перад сабой, перад іншымі, нават перад роднай зямлѐй, што сведчыць пра экзістэнцыйны страх героя.
Цікава, што аўтар не ўскладае на пейзаж сігнальную функцыю паведамлення пра небяспеку (як гэта робіць большасць аўтараў, пішучых у жанры містыкі). Наадварот, у творы прырода аказвае суцяшальны, рэлаксуючы эфект на героя: «Здаецца Юрдоку, што адчуваюць яны [дубы. – Н. К.] ягонае збалелае сэрца, супакойваючы,

шэпчуць, абнадзейваюць, але ѐн не можа зразумець мудрасць вечных дрэў, не здольны пакуль убіцца ў глыбіню іх спагады» [1, с. 211].
Містычнае ў творы, такім чынам, праз звышнатуральнае
раскрывае рэальнае, абуджае тугу, уздымае экзістэнцыйныя праблемы пакінутасці чалавека ў свеце, віны перад сабой за адчужанасць ад сапраўдных пачуццяў, жаданняў і думак, адзіноты. Праз містыку паглыбляецца псіхалагізм у творы. Звышнатуральнае становіцца прычынай перажыванняў героя, не проста ўплятаецца ў сюжэт, а служыць яго асновай.
Раман «Ноч цмока» В. Гапеева, пачынаючыся як дэтэктыў постмадэрнісцкай версіі з крыху незвычайнай завязкай, пабудаваны «як калаж інтэрпрэтацый, кожная з якіх у роўнай ступені можа прэтэндаваць на аналагізацыю» [2, с 80], паступова набывае ўсѐ
РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

больш містычны каларыт. За аснову пісьменнік узяў беларускі фальклор. Галоўны герой, Васіль Шайбак, да пэўнага часу лічыць містычнае выдумкай, пасля – неад‘емнай часткай рэчаіснасці, у якую здольныя пранікаць толькі ведзьмары. Ірэальная частка сюжэта часам падаецца сном героя. Вобразы цмока, яшчура, ведзьмака ўспрымаюцца напачатку толькі дадаткам да следства, і аўтар удала карыстаецца гэтым, каб паступова павялічыць напружанне і вывесці сюжэт да сапраўды нечаканай развязкі.

Стварэнню таямнічай атмасферы, поўнай загадак, цесна пераплеценых з паранармальным, у значнай меры спрыяюць аўтарскія апісанні. Свет рамана паўстае ў іх пахмурным, бязрадасным, а пражытыя героямі дні – бясконца паўтаральнымі, аднатыпнымі: «Адзін дзень падобны да другога, ранкі не розняцца ад надвячоркаў, начэй без зорак. Мне здаецца, такое надвор‘е – пахмурнае, без дажджоў, іншым разам з мокрым пылам у паветры – было тут заўсѐды і будзе заўсѐды» [3, с. 177]. Няцяжка ўявіць сабе, які эмацыйны выбух адбудзецца ў персанажаў, калі ў такую рэчаіснасць дадаецца містыка з яе загадкавасцю і непрадказальнасцю. У выніку твор не толькі не страчвае сваѐй займальнасці, а наадварот, шматразова яе павялічвае.

У рамане вытлумачваецца і сама сутнасць міфа, які заўсѐды мае пад сабой рэальную аснову. Так, герою даводзяць, што карані міфа пра шлюб з яшчурам цягнуцца ўглыб вякоў, да часоў існавання жрацоў і старэйшын плямѐнаў, калі выконваліся старажытныя абрады, амаль цалкам страчаныя ці значна спрошчаныя ў нашыя дні: «Яшчур насамрэч старэйшына племені ці вярхоўны жрэц, які праводзіў агледзіны дарослых дзяўчат. І карагод вадзілі яны голымі, а ѐн выбіраў сабе ці то памочніцу, ці то наложніцу. Адначасова з гэтым дазваляючы найбольш спелым выходзіць замуж у бягучым годзе» [3, с. 195].



Галоўны герой, спрабуючы разабрацца ў забойстве, адкрывае шмат новага, вучыцца глядзець углыб рэчаў і шукаць іх патаемны сэнс. Да таго ж, Васіль паступова далучаецца да народнага светаадчування, і яму адкрываецца складаны сусвет міфалогіі, паколькі Шайбак шчыра імкнецца яго спазнаць. Г. Насельцава адзначае: «У цэнтры ўвагі Валерыя Гапеева сучасны чалавек, якога можна назваць кансерватыўным, у нейкай ступені эгаістычным, але які ўсѐ ж мяняецца пад уплывам не столькі знешніх абставін, колькі раскрытага ў творы мікраасяроддзя» [4, с. 180].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Міфічнае ў рамане паўстае тым бокам рэчаіснасці, да якога нельга прымяніць звычайную логіку. Добрае ці злое, яно з‘яўляецца адлюстраваннем мудрасці народа і рэакцыяй на рэальныя праблемы, якое можна зразумець толькі сэрцам. Твор прапануе адразу два погляды на міф: для рэалістаў – як на крыніцу народнай мудрасці, для аматараў звышнатуральнага – як на невытлумачальную рэч, што існавала і будзе існаваць у свядомасці ўпэўненага ў сваім усѐведанні чалавека, каб парушыць аднойчы створаную ім ілюзію бяспечнага і прадказальнага ў сваѐй паўтаральнасці жыцця. Гэта можна лічыць пацверджаннем пабудовы рамана як калажу інтэрпрэтацый.

З містычнай асновай твора цесна звязана і катэгорыя страху, які ўзнікае не ў выніку нагнятання рэальных падзей, а менавіта праз пачуццѐ безабароннасці перад невядомым. Упершыню трапіўшы ў непадуладныя розуму абставіны, герой адчувае сапраўдны жах:

«І толькі цяпер я адчуў вакол сябе нішто. Так, не цішыню, а адсутнасць усяго. Адсутнасць хоць нечага жывога. Туман быццам увабраў у сябе не толькі гукі, а самі жыцці, вобразы і сутнасці. Я зрабіў крок і другі да сцяжынкі, прайшоў па ѐй і стаў, аглушаны не гукам сваіх крокаў, а іх адсутнасцю. Трава не адгукалася на дотык!» [3, с. 212].

Нельга сказаць, што чытач, услед за героем, пачынае адчуваць страх, хаця містычны твор мае звычайна і такую задачу, бо тэкст, урэшце, набліжаецца да жанру казкі. У некаторых эпізодах змяняецца нават рытм аповеду: ѐн становіцца паскораным, перарывістым, быццам у сне, што спрыяе стварэнню таямнічай атмасферы.

Такім чынам, містычныя элементы ў творах «Дзеці ночы», «Нішто» А. Казлова і «Ноч цмока» В. Гапеева могуць ставіць традыцыйную для жанру мэту напужаць чытача ці паглыбіцца да ўзроўню міфалагічнай свядомасці – рэальнасці, якая жыве па сваіх законах і прываблівае непрадказальнасцю. Гэта дазваляе трымаць чытача ў заўсѐдным напружанні, якое павялічваецца праз спалучэнне містыкі з дэтэктыўнай сюжэтнай лініяй. Аўтары звяртаюцца да беларускага фальклору, уводзяць персанажаў, зразумелых сучаснаму



чытачу. Часта праз містыку асэнсоўваюцца актуальныя праблемы сучаснасці (бяздомнасць, адзінота чалавека ў свеце, пошук грамадскага лідара і інш.).

**Спіс літаратуры**

1 Казлоў, А. Горад у нябѐсах / А. Казлоў. – Мінск : Літаратура

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

і мастацтва, 2009. – 224 с.
2 Можейко М. А. Философия детектива: классика – постнеклассика / М. А. Можейко // Искусство и культура. – 2011. – № 1. – С. 76–82.
3 Гапееў, В. Ноч цмока / В. Гапееў. – Мінск : ПВУП «Галіяфы», 2016. – 260 с.
4 Навасельцава, Г. В. Жанрава-стылѐвая адметнасць рамана Валерыя Гапеева «Ноч цмока» / Г. В. Насельцава // Наука – образованию, производству, экономике : материалы XXIII (70) Региональной науч.-практ. конференции преподавателей, научных сотрудников и аспирантов. – Витебск : ВГУ им. П. М. Машерова, 2018. – Т. 1. – С. 179–181.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ